В совместных боях с Красной Армией партизаны Белоруссии приобретали боевой опыт, учились взаимодействию, вырабатывали свою партизанскую тактику. Действиям партизан, хотя и имевшим много общего с боевыми действиями регулярных сил, были присущи специфические особенности. На контролируемой противником территории они решали задачи как путем прямых боевых действий (засада, налет, наступление, оборона), так и не вступая в непосредственное соприкосновение с ним (диверсия). К концу августа 1941г. вследствие полной оккупации территории Белоруссии и дальнейшим отходом на восток частей Красной Армии, прямые контакты между партизанскими формированиями и регулярной армией прекратились. Снабжение партизан по воздуху и другие формы взаимодействия были практически невозможны из-за тяжелого положения на фронте, малочисленности партизанских отрядов и групп, отсутствия у них постоянных мест дислокации и радиосвязи. Этим и объясняется то, что осенью 1941г. партизанские формирования Белоруссии действовали полностью автономно по отношению к частям Красной Армии [2].

**Литература**

1. *Попов А. Ю., Цветков А. И.* Русский диверсант Илья Старинов. – СПб.: Издательский Дом «Нева», 2003. – 192 с.
2. Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков. В 3 т./ Гл. редколлегии А.Т.Кузьмин. – Мн.: Беларусь, 1985. – 591 с, 551 с, 531 с.
3. Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны (июнь 1941-июль 1944): Документы и материалы. В 3 т./ Под общей редакцией А. Т. Кузьмина. – Мн.: Беларусь, 1982. – 743 с, 814 с, 792 с.
4. *Долготович Б. Д.* Беларусь в годы Великой Отечественной войны. – Мн. Полымя, 1994. – 141 с.
5. *Калинин П. З.* Партизанская республика. – Мн.: Беларусь, 1973. – 308 с.

## АБОЗ ВОЙСКА ВКЛ У XV–XVI ст.ст.

**А. А. Іваноў**

Напрыканцы XX ст. на Беларусі узнікла цікавасць да ваенна-гістарычнай рэканструкцыі, якой на сённяшні дзень займаюцца шматлікія рыцарскія клубы, аматары гісторыі і прафесійныя даследчыкі, якія фактычна закладваюць падмурак для афармлення нацыянальнай школы вайсковай гісторыі. Аднак гісторыя войнаў гэта не толькі гісторыя бітваў, але і вывучэнне матэрыяльна-тэхнічнай базы і эвалюцыі дапаможных службаў, сярод якіх важкае месца займае абоз.

Сёння можна смела сцвярджаць, што абоз як адзінку войска, можна разглядаць як у шырокім, так і ў вузкім сэнсе гэтага слова. У вузкім

сэнсе абоз успрымаецца як статычная адзінка: спалучэнне транспартных сродкаў, фуражу, ваенных прылад. Рэальна ж сярэднявечны абоз- гэта ўсё войска, сабранае у паходным парадку, разам з прыслугай, матэрыяльнымі сродкамі, транспартнымі сродкамі і ўсімі дапаможнымі службамі.

Найменшай адзінкай абозу з'яулялася павозка, якая магла мець розныя памеры і розную будову. Адрозненні маглі быць, ў першую чаргу, у памерах колаў, што залежала ад перавозімага цяжару і ад умоў мясцовасці. Другім важным момантам з'яўлялася трываласць павозак і іх захаванасць ад механічных пашкоджанняў, якая забяспечвалася з дапамогай металічных дуг, пасоў, чэпаў [6, с.255]. Да таго ж вазы маглі быць як крытыя, так і адкрытыя. Даследчыкі Г. Дэльбрук і А. Навакоўскі вылучаюць у пачатку XV стагоддзя з'яўленне так званых баявых вазоў што звязана з пашырэннем ужывання тактыкі прымянення вагенбургаў (умацаваных абарончых збудаванняў з павозак). Дзеля гэтага збоку паміж коламі прывешвалася дошка, якая магла вытрываць удары невялікіх снарадаў і перашкаджала пранікненню ў лагер пад нізам вазоў [1, с. 355–357].

Адрознівалася і колькасць запрэжаных у павозкі коней, якая магла вагацца ад 1 да 4, ізноў жа ў залежнасці ад перавазімага груза. Так, аднаконная павозка магла перавозіць да 600 кг, пры гэтым хуткасць яе перамяшчэння не перавышала 25 кіламетраў у суткі [6, с.255]. Павозкі звычайна ішлі радамі (калонамі): да чатырох радоў. Адно цяжка сцвярджаць: абоз у час маршу ішоў суцэльным гулам, альбо ўсё ж такі захоўваўся прынцып прыналежнасці тых ці іншых павозак да сваёй харугвы, а значыць існавала магчымасць, што у шэраговым парадку за кожнай харугвай цягнуўся яе ўласны абоз. Што тычылася стаяння лагерам, то тут сітуацыя больш зразумелая: пры кожным атрадзе ля намётаў стаялі іх ўласныя павозкі. Выключэнне мог складаць, хіба што, толькі агульнавайсковы абоз. [3, с.105].

Забеспячэнне дысцыпліны, вызначэнне нормаў паводзін і парадку дзеянняў абоза, нормы пакаранняў за правіны і крымінальныя злачынствы рэгламентуюцца існуючым заканадаўствам, а ў XVI ст. абапіраюцца на нормы статутаў і на ваенныя артыкулы каманднага саставу, найбольш вядомымі якіх з’яўляюцца ваенныя артыкулы пана Тарноўскага перыяду Лівонскай вайны [7,с.240–255].

Можна смела сцвярджаць, што абоз- гэта своеасаблівая паходная дзяржава са сваімі органамі ўлады, заканадаўствам і шырокім колам выконваемых функцый, сярод якіх можна вызначыць транспартную, гаспадарчую, медыцынскую і рэлігійную, якія дастаткова добра

апісваюцца ў шматлікіх пісьмовых крыніцах, прысвечаных апісанню ваенных выпраў[4, с. *17,* 76, 87],

Адным з найбольш цікавых і адначасова складаных з'яўляецца пытанне фінансавання і матэрыяльнага забеспячэння абоза. Дакладна невядома, якая частка «галоушчыны» і «серабшчызны» (галоўных ваенных падаткаў) ішлі непасрэдна на забеспячэнне абоза. Трэба зазначыць, што феадалы Княства яшчэ ў 447 годзе згодна з земскім прывілеем Казіміра былі вызвалены ад выплаты падатку на вайсковыя патрэбы –«серабшчызны» [5, с.41], ды і памер яе вагаўся у залежнасці ад сацыяльнага статуса падаткаплацельшчыка і ад крытычнасці моманту.

Важна яшчэ і тое, што забеспячэнне правіянтам з'яўлялася абавязкам саміх рыцараў, а папаўненне правізіі адбывалася згодна нормам існуючага заканадаўства з пазбяганнем гвалту, насілля і пад кантролем адказных асоб. віжоў, падначаленых непасрэдна гетману[3, с.109].

Аднак найбольш складанай з'яуляецца праблема вызначэння месца абозу ў баі і вызначэнне спосабаў яго непасрэднага практычнага выкарыстання ў час баявых дзеянняў,

Калі прытрымлівацца пэўных храналагічных межаў, то разгляд гэтага пытання неабходна распачаць з апісання Грунвальдскай бітвы 1410 года і апісання месцараспалажэння абозу ў ёй. Дакладна вядома, што і армія Ордэна, і саюзныя войскі за некалькі дзён да бітвы занялі свае пазіцыі на пэўнай адлегласці^ адно ад аднаго. Месцараспалажэнне войска, хутчэй за ўсё, і стала месцам знаходжання абоза ў час бітвы, тым больш, што Ян Длугаш у сваёй «Хронікы.,.» узгадвае той момант, калі стаўшы твар да твару, ордэнцы, каб заманіць літоўскую і польскую конніцы ў т, зв. «воўчыя ямы» і вымусіць менавіта іх распачаць бойку, адыйшлі на пэўную адлегласць назад. Наўрад ці ў такім выпадку абоз меўся на месцы баявой пазіцыі войска, таму што адцягванне яго за лінію войск заняла б значны час і зрабіла б абоз вельмі прывабным для атакі і захопу з боку ворагаў. Хутчэй за ўсё, той жа тактыкі прытрымлівалася саюзнае войска Польшы і ВКЛ, тым больш, што Длугаш неаднаразова ўзгадвае з'яўленне ганцоў з поля боя ў лагеры для атрымання падмогі або са свежай інфармацыяй аб стане спраў [4, с.78–80]. Так, непасрэдна ўзгадваецца з'яўленне Вітаўта ў польскім лагеры ля паходнай часоўні, калі ён заклікаў караля .Ягайлу як мага хутчэй уступіць у бой, рушыўшы на падмогу ліцвінам польскія атрады на лінію боя, што непасрэдна сведчыць аб аддаленасці пазіцый лагера з абозам ад лініі баявых дзеянняў.

Такая ж сітуацыя назіраецца і падчас Лівонскай вайны 1558 – 1582 гг. Так, у дыярыўшах Ст. Баторыя ўзгадваеца асада Веліжа , калі з агульнага абозу, размешчанага на даволі значнай адлегласці ад месца асады, пасылаюцца рэзервныя атрады, харч і інжэнерна-тэхнічныя сродкі. Цікава, што менавіта пры абозе знаходзілася стаўка караля, так як многія яго пісьмы з паручэннямі і загадамі якраз і напісаныя ў месцы стаяння абоза[7, с.190].

Невыключана. што дадзенае становішча было характэрнае для доўгіх ваенных кампаній і запланаваных, строга стратэгічных бітв. Тым больш трэба зазначыць. што такая пазіцыя непасрэдна звязана са стратэгіяй будавання ўмацаванных вайсковых лагераў, т. зв. «вагенбургаў», аб чым будзе сказана крыху пазней.

Аднак незаўжды бітвы насілі запланаваны характар. Нярэдкімі былі спантанныя сутыкненні, нечаканыя сустрэчы падчас паходаў, атакі на абоз падчас маршу, пераправы войска альбо ў час пагоні, праследвання адступаючага войска, калі будаванне, разгортванне ўмацаванага лагера было немагчымым. Якую ж пазіцыю ў такой сітуацыі павінен быў займаць абоз на полі боя?

Пры разглядзе дадзеннага пытання узнікаюць некалькі магчымых рашэнняў: адцягванне абозу за спіны асноўных баявых шэрагаў у тыле, змяшчэнне абоза ў цэнтр войск. Кожны варыянт мае свае станоўчыя і адмоўныя бакі.

Апошняе важнае і самае спрэчнае пытанне пры вывучэні абоза ВКЛ звязана з практыкай пабудовы ўмацаваных абозных лагераў вагенбургаў. а таксама з магчымасцю пераняцця тактыкі гусітаў у XV ст. Польскі даследчык А.Навакоўскі ў сваім артыкуле «Spret taborowy, obozowy i przeprawowy» ставіць над сумненне існаванне ў Польшы і ВКЛ ў пачатку XV стагоддзя навыкаў і вопыту пабудовы вагенбургаў[6,с. 254–255]. Аднак апісанне бітвы на р.Ворскле ў 1399 г., якое пададзена ў Патрыяршым летапісе: «... і ста Вітовт на брезе с телегі кованыя чепом умацаваныя...»[2, с. 234] –гэта ніштo іншае як апісанне вагенбурга, якія на нашай тэрыторыі выкарыстоўваліся яшчэ да афармлення гусіцкага руху ў Еўропе.

Сказаць, калі дакладна пачалі прымяняць на землях ВКЛ вагенбургі, вельмі складана, Магчыма, запазычанне адбылося праз Ордэн, да якога Вітаўт неаднаразова звяртаўся за дапамогай у час барацьбы з Ягайлам за вялікакняскі пасад [4, с. 28–291].

Другі магчымы шлях з'яулення вагенбургаў на нашых землях і пачатак іх прымянення можа быць звязаны з удзелам чэшсюх рыцараў у

Грунвальдскай бітве на баку братоў славян, Дарэчы, прымаў удзел у гэтай бітве і Ян Жыжка. – адзін з будучых лідэраў гусіцкага руху,

Апошні магчымы шлях запазычвання не толькі тактыкі будавання вагенбургаў, але ўжо разам з тым і тактычных навінак «гусіцкай вытворчасці» звязаны з імем ўжо згаданага намі Жыгімонта Карыбутавіча, які доўгі час ваяваў у чэшскіх землях на баку гусітаў і быў асабістым сябрам ЯнаЖыжкі.

Як вынік можна зазначыць, што абоз войска ВКЛ у XV–XVIст.ст. не значна адрозніваўся ад абозу іншых еўрапейскіх краін, увабраўшы ў сябе як традыцыі Усходу, так і традыцыі Захаду, а яго камплектаванне, забеспячэнне і ўнармаванне абозных парадкаў ажыццяўлялася згодна з тагачасным заканадаўствам.

**Літаратура**


1. *Дельбрюк Г.* История военного искусства в рамках политической.истории в 5 томах. – М.: Государственное военное издательство наркомата обороны СССР.1936-940.Т3. Средневековье,937.-514ст.
2. ПСРЛ. .Сиб,:Тип.Л, Н.Скороходова,1897.Т 11: Патриаршая или Никоновская летопись.-254ст.
3. Статут Вялікагакняства Літоускага1588: Тэксты. Даведкі. Каментарыі. /Беларус. Сав. Энцыкл. РэдІ.П.Шамякін і інш.- Мн.:БелСЭ,1989.-573ст.
4. Ян Длугош. Грюнвальдская битва.-М.:Изд. АН СССР. 1962.
5. *Бохан Ю. М.* Наёмнае войска у Вялікім княстве Літоўскім у ХУ–ХУ1стст.- Мінск:Інстытут історыі НАН Беларусі,2004.–92ст.
6. *Nowakowski A.* Spret taborowy, obozowy i przeprawowy// Polska technika wojskowa do 1500roku. Warszawa.1994.
7. Sprawy wojenne kiola Stefana Batorego, Dyjaryjusze, relacyje, listy i akta z lat 1576-1586. Zebrab i wydal X. Ignacy Polkowski. Krakow,1887.


## УЗАЕМААДНОСІНЫ Ў АСЯРОДКУ СЯЛЯНСКАЙ АБШЧЫНЫ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ


**Н. М. Карбалевіч**


Грамадскія традыцыі асновы беларускага этнасу – беларускага сялянства – маюць глыбокія карані. Яны фарміраваліся напрацягу стагоддзяў пад уплывам знешніх і ўнутраных фактараў і захоўваюць у сабе шматгадовы гістарычны досвед беларускага народа. Да таго ж грамадскія традыцыі ахопліваюць адну з самых цікавых сфераў чалавечага жыцця – сферу чалавечых адносін, а значыць, захоўваюць у сабе і агульначалавечы досвед. Сялянская абшчына таксама з’яўляецца мадэллю калектыўнага дзеяння, вывучэння якога прадстаўляе цікавы бок не толькі грамадства, але і псіхалогіі чалавека.